СН+
№8 (903)
Вторник 23 февраля 2021 года
16+
СНПЛЮС СВОБОДНЫЕ НОВОСТИ ПЛЮС
Ежедневная общественно-политическая газета. Издается с сентября 2002 года.
Издатель: **ООО «СНплюс»**. Цена свободная.
Тел. 238-37-40, **E-mail: snplus@tut.by, www.sn-plus.com.**

АДКРЫТЫ ЛІСТ ПА ПАДТРЫМЦЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І КУЛЬТУРЫ

Яго падпісалі больш за 70 экспертаў у галіне беларускай мовы і культуры. Сярод падпісантаў — лаўрэатка Нобелеўскай прэміі Святлана Алексіевіч, пісьменнікі Уладзімір Арлоў, Альгерд Бахарэвіч, Уладзімір Някляеў, музыкі Уладзімір Пугач, Лявон Вольскі, Зміцер Вайцюшкевіч і іншыя паважаныя асобы.



«Беларуская мова і нацыянальная культура апынуліся ў вельмі цяжкім становішчы. Гэта вынік не толькі маштабнага дзяржаўнага крызісу апошніх месяцаў, але і мінулых дваццаці шасці гадоў. Пры гэтым заняпад беларускай культуры — не проста збег абставін ці нейкіх знешніх фактараў, а вынік дзяржаўнай палітыкі: палітыкі згортвання беларусізацыі, барацьбы з уласнай спадчынай і нацыянальнай памяццю, барацьбы з беларускасцю, будавання не паўнавартаснай нацыянальнай культуры незалежнай дзяржавы, а залежнай, другаснай, рэшткавай культуры.

Зусім не дзіўна, што ў працаўнікоў гэтай сферы і да выбараў 09.08.2020 былі сур'ёзныя прычыны не падтрымліваць дзейную ўладу. А фальсіфікацыя, беспрэцэдэнтны гвалт у дачыненні да мірных беларусаў і беспакаранасць вінаватых сталі апошнім штуршком і не пакінулі іншага выбару беларускай інтэлігенцыі, апрача як пратэставаць. За гэта яны адчулі на сабе ўвесь спектр рэпрэсій: пагрозы, звальненні, арышты, прымус да эміграцыі, паклёп, разгон цэлых калектываў, закрыццё ўстаноў культуры.

Пры гэтым Беларусь мае вялікі патэнцыял, каб адраджаць і развіваць сваю нацыянальную культуру. У нас ёсць галоўнае для гэтага — свая незалежная дзяржава, хаця ўлады зрабілі шмат, каб паставіць незалежнасць пад пагрозу. У нас ёсць адукаванае грамадства, а таксама матываваная, таленавітая, крэатыўная, сучасная еўрапейская моладзь. У нас ёсць інстытуцыянальная база, створаная мінулымі пакаленнямі. У нас ёсць неймаверны нацыянальны ўздым, энергія народа.

У нас ёсць дастаткова паважаных, максімальна кампетэнтных спецыялістаў у сферы нацыянальнай культуры, якія гатовы праводзіць узважаныя, добра прадуманыя, але ў той жа час рашучыя рэформы ў сферы культуры. Мы, ніжэйпадпісаныя дзеячы і эксперты ў беларускай мове і культуры, заяўляем аб гатоўнасці дапамагчы сваімі ведамі і дзейнасцю ў справе рэфармавання ў гэтай галіне.

Важна назваць і апісаць асноўныя прынцыпы і прыярытэты, згодна з якімі яны будуць вырашацца наяўныя праблемы.

Папярэднія ўмовы

Мы перакананы, што без рэалізацыі гэтых найважнейшых, тэрміновых крокаў у грамадскім жыцці немагчымы ніякі выхад з цяперашняга крызісу, у тым ліку і ў сферы беларускай культуры:

Неадкладнае спыненне палітычных рэпрэсій у дачыненні да ўсіх дзеячаў культуры і мастацтва, як і да ўсіх грамадзян Беларусі. Вызваленне палітвязняў, забеспячэнне магчымасці бесперашкодна прыехаць у Беларусь тым, хто быў выгнаны з краіны.

Аднаўленне на пасадах дзеячаў культуры, звольненых і вымушаных звольніцца па палітычных матывах; забеспячэнне ім ранейшых умоў працы; прыцягненне да адказнасці вінаватых у супрацьпраўным звальненні (ганенні, прымусе да звальнення).

Правядзенне новых, сумленных выбараў, пасля чаго новыя ўлады, маючы народны давер, змогуць ажыццяўляць неабходныя рэформы і змены ў заканадаўстве.

Пасля выканання гэтых передумоў дзяржава зможа выправіць катастрафічнае становішча беларускай культуры, кіруючыся наступнымі прынцыпамі.

У сферы дзяржаўнага будаўніцтва:

1. Гарантыя незалежнасці як першасная ўмова выжывання і развіцця беларускай культуры і беларусаў як народа. Ніякі гандаль суверэнітэтам не можа быць апраўданы. Адной з галоўных мэтаў самога існавання беларускай дзяржавы павінна быць адраджэнне і развіццё беларускай культуры, незалежнасць беларускага культурнага і інфармацыйнага поля, узмацненне ў грамадстве беларускай ідэнтычнасці, беларускіх каштоўнасцей.

2. Заканадаўчая абарона беларускай мовы, нацыянальнай сімволікі як неад'емных атрыбутаў дзяржаўнасці. Бел-чырвона-белы сцяг, герб «Пагоня», беларуская мова павінны атрымаць пацверджаны статус нацыянальных сімвалаў, якія абараняюцца Законам.

3. Прыняцце дзяржавай на сябе абавязку павышэння моўна-культурных кампетэнцый усіх дзяржаўных службоўцаў: авалоданне беларускай мовай, веданне беларускай гісторыі, культуры. Пасля адпаведнай дапамогі дзяржаўным службоўцам з боку дзяржавы ўсе беларусы змогуць атрымліваць якасныя паслугі і рэалізаваць свае моўна-культурныя правы.

4. Стварэнне, зацвярджэнне і рэалізацыя дзяржавай агульнанацыянальнай стратэгіі адраджэння беларускай мовы і культуры (далей — Стратэгія) з выразна акрэсленымі мэтамі, выканаўцамі і гарызонтам часу выканання. Такія праекты ўжо распрацоўваліся, у прыватнасці Таварыствам беларускай мовы, але Стратэгія павінна быць прынята дзяржаўнымі ўладамі як доўгатэрміновы практычны арыенцір і крытэрый ацэнкі дзейнасці ўрада ды профільных органаў, установ.

У сферы інфармацыйнага поля:

5. Фармаванне незалежнага інфармацыйнага поля Беларусі. На тэлебачанні, радыё, у Інтэрнэце, кіно, музыцы павінны дамінаваць беларускія пляцоўкі і прадукты, самастойныя і беларускацэнтрычныя па змесце.

6. Забарона цэнзуры, забеспячэнне роўных умоваў для прыватных і грамадскіх СМІ, дэідэалагізацыя СМІ, недапушчэнне прапаганды. Падсправаздачнасць грамадскіх СМІ непалітычным органам грамадскага кантролю. Поўная рэдакцыйная аўтаномія СМІ.

У сферы адукацыі:

7. Аўтаномія ўсіх вышэйшых навучальных устаноў (незалежна ад формы ўласнасці), Балонскі працэс, выбарныя рэктары і ўлады ВНУ. Акадэмічная свабода пры выкананні агульнанацыянальнай Стратэгіі. Залежнасць фінансавання з боку дзяржавы ад эфектыўнасці, акадэмічных поспехаў і рэалізацыі Стратэгіі. Абарона ад цэнзуры і палітычнага падпарадкавання. Дэідэалагізацыя, дэпалітызацыя навучальных і акадэмічных інстытутаў.

8. Рэформа школы. Аўтаномія школ пры выкананні агульнанацыянальнай Стратэгіі і падсправаздачнасць перадусім мясцовым уладам. Пазбаўленне школ ад палітычных задач, кадравыя змены у выніку прыцягнення да адказнасці супрацоўнікаў школ за ўдзел у фальсіфікацыях выбараў.

9. Безумоўнае забеспячэнне магчымасці атрымоўваць адукацыю на ўсіх узроўнях і па ўсіх спецыяльнасцях на беларускай мове. Адказнасць дзяржавы за стварэнне матэрыяльных умоў для гэтага.

У сферы культурных ініцыятыў:

10. Захаванне наяўных культурных устаноў, асабліва на лакальным узроўні з асноўным кірункам дзейнасці — захаванне і адраджэнне беларускай нацыянальнай культуры. Мэтавыя гранты ад дзяржавы на дзейнасць культурных устаноў усіх узроўняў пры гарантыі іх аўтаноміі і выкананні агульнанацыянальнай Стратэгіі.

11. Падтрымка дзяржавай незалежных, грамадскіх культурных ініцыятыў на аснове грантавай сістэмы з захаваннем аўтаноміі арганізатараў і прыярытэту для такіх ідэй, што накіраваны на захаванне і развіццё мясцовых традыцый, на папулярызацыю беларускай культуры як часткі сусветнай, на ўзмацненне беларускай ідэнтычнасці.


Безумоўна, гэта не поўны пералік праблем і неабходных дзеянняў з боку беларускай улады. Аднак гэта прыярытэты, без якіх пад пагрозай будуць заставацца і дзеячы беларускай культуры, і ўсе яе носьбіты, і само існаванне нашай нацыянальнай культуры.

Большасць беларусаў, незалежна ад узроўню іх адукацыі, нацыянальнай свядомасці і зацікаўленасці беларускай культурай, хоча жыць у свабоднай, незалежнай краіне, у дзяржаве, якая выклікае гонар сваіх жыхароў, якая мае адказную, адукаваную, асвечаную ўладу.

Мы верым, што хутка Беларусь будзе менавіта такой. Для нас будзе гонарам паспрыяць гэтаму, даўшы сваю экспертызу і працу для неабходных рэформаў».

КТО НА САМОМ ДЕЛЕ ВВОДИТ САНКЦИИ

Дополнительные санкции против белорусских чиновников и судей ввели США и Великобритания, что вызвало негодование государственных СМИ Беларуси. Они даже предлагают наказать тех белорусских граждан, которые призывают Запад усилить санкции.



ВАЛЕРИЙ КАРБАЛЕВИЧ

ЛИЧНОЕ МНЕНИЕ

Нарастание политических репрессий

Между тем санкции против экономики Беларуси и гражданского общества активно вводятся самими белорусскими властями. И они носят фактически секторальный характер. Ущерб, нанесенный стране от таких действий правящего режима, несопоставим с потерями от западных санкций.

На Всебелорусском народном собрании Александр Лукашенко фактически объявил поход против белорусского бизнеса. Признался, что приказал закрыть около двух сотен предприятий общественного питания и быта за демонстрацию политической нелояльности.

Выполняя указания Лукашенко, Комитет госконтроля подготовил соответствующие меры. В сети Интернет появились сканы письма, которое КГК направил Министерству финансов. В нем предлагается увеличить ставку налога для индивидуальных предпринимателей более чем в три раза и повысить минимальный размер отчислений в Фонд социальной защиты. Это может привести к прекращению экономической деятельности большинства ИП. Как сказал Лукашенко, пусть идут работать на МАЗ.

Есть информация, что власти обсуждали вопрос о закрытии Парка высоких технологий по политическим причинам. Но ограничились повышением налогов для работников ПВТ.

А вот санкции (а точнее репрессии) против гражданского общества и всех, кто участвовал в протесте, осуществляются последние несколько месяцев во все нарастающем масштабе. Наступление идет широким фронтом, по секторам. Каждый день приходят сообщения об очередных задержаниях, обысках, судах. Приводим только краткую хронику.

Идет давление на активистов экологического движения.

16 февраля следователи пришли в квартиры более 40 правозащитников, журналистов, представителей независимых профсоюзов и офисы 4-х организаций, включая незарегистрированную правозащитную «Весну» и Беларусский союз журналистов. Искали материалы о финансировании акций протеста.

Тем временем в стране продолжает работать судебный конвейер. Наиболее громкие суды над политическими оппонентами проходят фактически в закрытом режиме. На них не пускают независимые СМИ.

Завершился один из самых скандальных судебных процессов. Журналистки телеканала «Белсат» Екатерина Андреева и Дарья Чульцова за стрим с акции протеста были приговорены к 2 годам лишения свободы в колонии общего режима.

Начался суд над главным оппонентом Лукашенко, самым популярным политиком Беларуси Виктором Бабарико. Журналистов крупнейших негосударственных СМИ на него не аккредитовали.

Министерство юстиции лишило лицензий четырех адвокатов за их принципиальную позицию в ходе массовых протестов.

17 февраля милиция и судебные приставы штурмовали протестантскую церковь «Новая жизнь» во время молитвы. Они описали имущество и изгнали верующих, угрожая арестом.

Возбуждаются уголовные дела по факту забастовок на госпредприятиях.

Одновременно с государственных предприятий (например, из филиалов «Минскэнерго») начали увольнять людей, участвовавших в акциях протеста.

Все задаются вопросом: кто следующий? Члены оппозиционных партий? Не случайно Лукашенко приказал перерегистрировать партии. Думаю, задача состоит в том, чтобы лишить правового статуса оппозиционные структуры.

Понятное дело, все эти репрессии создают нездоровую социально-политическую атмосферу, неблагоприятный бизнес-климат в стране и отпугивают инвесторов.

Законопроект об экстремизме

Власти идут по пути ужесточения законодательства. В частности, готовится законопроект об иностранных агентах.

Телеграм-каналы опубликовали законопроект «Об изменении законов по вопросам противодействия экстремизму». Главное нововведение законопроекта – практически неограниченное применение понятия «экстремизм» к любому виду общественной деятельности. Так, экстремизмом будет считаться «дискредитация органов государственной власти» и «Республики Беларусь». Или «разжигание социальной розни». Эти определения настолько «резиновые», что любую критику власти даже на уровне сельсовета, не говоря уже о Лукашенко, можно будет расценивать как экстремистскую деятельность.

Теперь нарушение порядка проведения массовых мероприятий будет считаться проявлением экстремизма. Каждый протестующий автоматически становится потенциальным экстремистом.

В проекте есть несколько совершенно экзотических формулировок. Так, теперь экстремизмом будут считаться действия против «общественной морали» и «уклада семейных отношений». Можно предположить, что в последнем случае речь идет о ЛГБТ.

Прокуроры областей и Минска получат право приостанавливать деятельность организаций даже за подготовку акций, которые могут быть оценены как экстремистские.

КГБ составит список экстремистских организаций и физических лиц. При этом в перечне поводов для включения в список есть такой: «иные основания, предусмотренные законом». Представляете, какая свобода рук появляется у КГБ.

Логика властей понятна. Чтобы держаться на штыках в ситуации, когда большинство населения противостоит режиму, необходимо криминализировать всю общественно-политическую деятельность, не контролируемую вертикалью. Поэтому инакомыслие, публичные выражения недовольства, критика государственных институтов будут объявлены экстремизмом.

Мы видим, как сейчас на процессах над политическими оппонентами прокуроры, судьи пытаются «натянуть сову на глобус», чтобы придумать законные основания для наказания. Теперь их работа станет намного проще.

Конечно, большинство населения в тюрьму не посадишь. Ставится задача напугать, заставить бояться.

Этим законопроектом власти хотят легализовать, узаконить произвол силовиков. Теперь они будут проводить репрессии якобы на законных основаниях.

И никого это не должно удивлять. В своем прежнем состоянии режим удержаться не может. Чтобы выжить, он должен безгранично наращивать жестокость. Работает инстинкт выживания.

Переговоры в Сочи

Встреча Лукашенко и Путина в Сочи 22 февраля длилась более шести часов. На повестке дня переговоров было много вопросов. И новый кредит, и возобновление споров по поводу дорожных карт, и др. Нет никакой информации о достижении каких-то конкретных договоренностях по итогам переговоров.

Однако, на мой взгляд, главной темой переговоров был вопрос, который даже не упоминался в официальных сообщениях. Речь идет о ревизии, пересмотре договоренностей, достигнутых Лукашенко и Путиным во время предыдущей встречи в Сочи 14 сентября прошлого года.

Напомню, что тогда в сентябре Москва решительно поддержала Лукашенко в его конфликте с протестующим обществом, но поставила условие: белорусский лидер должен в течение полутора лет осуществить транзит власти в Беларуси. Лукашенко пообещал.

Однако дорожная карта транзита, которую Лукашенко озвучил на Всебелорусском народном собрании, сильно отличается от тех сочинских договоренностей. Время транзита растянуто на более длительный срок, скорее всего, на пять лет, до 2025 года. И оказывается, что на самом деле это не совсем транзит. Ведь Лукашенко намекнул, что он не собирается уходить, планирует остаться, но не на посту президента, а на другой должности, например, в статусе главы Всебелорусского народного собрания, которому будут переданы важные государственные функции. Похожую схему реализовал Назарбаев в Казахстане. И Лукашенко хотел бы заручиться поддержкой Путина в реализации этого плана. Или, по крайней мере добиться того, чтобы не было сильного сопротивления Кремля.

Думаю, что у Лукашенко есть хорошие шансы получить согласие Путина на ревизию договоренностей от 14 сентября по ряду причин.

Во-первых, сейчас потребность в поддержке России не так велика, как в августе-сентябре прошлого года, когда кресло под Лукашенко шаталось, и белорусская номенклатура внимательно присмотрелась к позиции Москвы. За это время он укрепил свои позиции в стране и может более уверенно разговаривать с Путиным.

Во-вторых, смысл идеи транзита, конституционной реформы состоял в том, чтобы успокоить белорусское общество, предложить ему компромисс. В Москве считали, что одной голой силы недостаточно, нужно предлагать обществу пряник, уступки, иначе протесты будут продолжаться.

Но Лукашенко теперь прилетел на переговоры в качестве победителя и убедил Путина, что он подавил протесты без каких-либо уступок. Дескать, теперь никаких компромиссов не нужно.

В-третьих, очень важным моментом является то, что политическая ситуация в России изменилась, и Путин оказался в том же положении, или очень похожем, что и Лукашенко. Имею в виду российские протесты. И теперь Лукашенко имеет полное право сказать: мы с тобой в одной лодке, вместе с «цветными революциями» воюем.

Поэтому Путину будет сложно подталкивать Лукашенко к диалогу с беларусским обществом, потому что сам он не ведет никакого диалога с российским обществом. Президенту РФ теперь не с руки обвинять коллегу в жестоких репрессиях, потому что он делает то же самое со своими оппонентами в самой России. И как можно обсуждать тему суда над Виктором Бабарико? Ведь Путин точно так же посадил в тюрьму своего главного противника. Какие тут могут быть претензии?

В-четвертых, за последние полгода у России обострились отношения с Западом из-за «дела Навального». И теперь Путин с Лукашенко оказались в одном окопе. Таких верных союзников в борьбе с Западом в России точно нет.

Все эти факторы работают в пользу согласия Путина на пересмотр сочинских соглашений от 14 сентября.

А все остальное – дополнение к основному вопросу. Напомню, накануне Беларусь и Россия подписали соглашение о транзите белорусских экспортных товаров через российские порты. И вопрос о продлении договора о размещении на территории Беларуси двух российских военных объектов практически решен. Это такие четкие жесты в сторону Кремля. Теперь можно просить новый кредит и переходить к новому этапу обсуждения дорожных карт интеграции.

З НОГ НА ГАЛАВУ

Улада мабілізавала на барацьбу з дэмакратычнымі сіламі ўвесь дыктатарскі механізм: ад чынавенства, сілавога блоку, дэпутатаў і да камунальнікаў, якія сталі ўдарнай сілай на фронце змагання з бел-чырвона-белымі стужачкамі.



СЯРГЕЙ ЗАКОННІКАЎ

ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ

Пры слове "дэмакратыя" тэлебачанне, як шматгаловы Змей Гарыныч, выпускае на людзей вялізныя языкі полымя і дыму, яго "элітныя" кадры, адзначаныя за адвагу ў вырабе гнюснай хлусні і паклёпаў, пырскаюць атрутнай слінай, сілавікі застрашваюча грукаюць дубінкамі па шчытах. А слова азначае простае, зразумелае паняцце – улада народа.

Сёння ў інфармацыйнай прасторы плавае шмат смецця: дэмагогіі палітыкаў і дыпламатаў, балбатні заангажаваных палітолагаў, высноў праплачаных экспертаў, спецслужбаўскія фэйкі. Тым не менш, праўда ёсць і, адстойваючы яе, трэба звяртацца да фактаў, якія аспрэчыць немагчыма.

Па-першае, высветлім: хто ў дыктатарскай Беларусі – народ? Маршы пратэсту 2020 года прадэманстравалі відовішча, якога не бачылі папярэднія пакаленні беларусаў. Народная сіла велічна цякла па цэнтральных вуліцах Мінска і іншых гарадоў краіны магутнымі калонамі, прыгожа аздобленымі бел-чырвона-белымі сцягамі, кветкамі, самаробнымі транспарантамі, плакатамі і – што галоўнае! – радаснымі ўсмешкамі людзей. Я неверагодна шчаслівы, што дажыў да непаўторнага часу.

Вялікія маршы і мітынгі мне вядомыя. У 1988 годзе ўдзельнічаў у першым Міжнародным Шаўчэнкаўскім свяце ў Харкаве, дзе разам з выдатнымі паэтамі, пазней Героямі Украіны Барысам Алейнікам, Іванам Драчом і Дзмітром Паўлычкам выступаў на плошчы ля помніка Кабзару. Украінская міліцыя налічыла на мітынгу каля 120 тысяч чалавек.

На наступны год свята не менш масава прайшло ў Кіеве. Калі я закончыў выступленне "крамольнымі" словамі "Слава Украіне!", бо госця ўсё ж не павінны арыштаваць, у адказ пачулася "Героям слава!" і плошча расквітнела жоўта-блакітнымі прапарамі. Сцягі ў СССР забаранялі, людзі прынеслі іх, хаваючыся ад кадэбістаў, пад вопраткай. Гэта было так нечакана, прыгожа і ўрачыста, што перахапіла дыханне.

У 1990 годзе давялося выступаць перад рабочымі на плошчы Леніна ў Мінску. Беларуская міліцэйская статыстыка тады не была ўшчэнт хлуслівай, як цяпер, і выдала лічбу – звыш 100 тысяч чалавек.

Згодна ацэнкі незалежных экспертаў на піку пратэстаў 2020 года ў краіне адначасова выйшла на вуліцы каля мільёна грамадзян. За жнівень-верасень-кастрычнік усяго ўдзельнічала ў пратэстах у Мінску, Брэсце, Віцебску, Гомелі, Гародні, Магілёве, Бабруйску, Баранавічах, Барысаве, Ваўкавыску, Вілейцы, Жлобіне, Калінкавічах, Лідзе, Мазыры, Маладэчне, Навагрудку, Наваполацку, Оршы, Полацку, Слоніме, Смаргоні, іншых малых гарадах і пасёлках звыш 2 мільёнаў чалавек. Хто не верыць, хай пераправерыць, бо падлікі засталіся. Тым не менш, дыктатарскі рэжым гэтых людзей лічыць народам не хоча.

А дзве з паловай тысячы "службоўцаў з партфелямі" на казённым "Всебелорусском народном собрании" рэжым абвяшчае народам. А. Лукашэнка сабраў наменклатуру, дэпутатаў, генералаў, палкоўнікаў, тэлебрахуноў і газетных хлусаў, праўладных вучоных, дзеля блізіру залу крыху разбавілі студэнтамі, механізатарамі, настаўнікамі. "Тэарэтыкам" далейшых дзеянняў рэжыму стаў "галоўны перамоўшчык паміж уладай і апазіцыяй", кіраўнік міфічнага "круглого стола демократических сил" Ю. Васкрасенскі, які з трыбуны кляўся ў любові да дыктатара, а за пацвярджэннем "ратавальных фантазій" звяртаўся да прэзідыума, дзе сядзелі яго куратары. Нічога сабе "выразитель народных чаяний"!

Дыктатура ўсё паставіла з ног на галаву. Пра гэта сведчыць любы аспект канфлікту паміж рэжымам і грамадзянамі. Народ не прагаласаваў за А. Лукашэнку, як уладзе хацелася, – значыць, ён вінаваты.

Але сапраўдныя зламыснікі, якія загналі сітуацыю ў тупік, выяўляюцца, калі адказаць на наступныя пытанні. Хто не дапусціў у склад выбарчых камісій народных прадстаўнікоў? Хто сарваў выбарчую канкурэнтнасць, не рэгіструючы, ізалюючы ў турмах, выпіхваючы за межы Беларусі кандыдатаў? Хто зрываў сустрэчы з выбаршчыкамі С. Ціханоўскай? Хто сфальсіфікаваў падлік галасоў і знішчыў дакументы? Сведчанняў парушэнняў закона для будучых судоў захавалася яшчэ шмат.

Цяпер глянем на паводзіны ўдзельнікаў пратэстаў і сілавога блоку. Людзі на маршах і маніфестацыях былі вытрыманымі, акуратнымі і толькі ў выключных выпадках адказвалі на лютасць сілавікоў, калі яна зашкальвала да немагчымага.

Але ж да якой меркі дайшоў страх прад мірным народам, што палкоўнік (!) ганяецца з дубінкаю за людзьмі, разбівае шкло, каб лавіць маніфестантаў. Пабегаў, падубасіў – і стаў генералам! Гэта штрых да агульнага партрэта тых, хто наладзіў і працягвае бязлітасны тэрор.

Усё нахабна перакулена. Тыя, што забіваюць, збіваюць, арыштоўваюць і катуюць, судзяць невінаватых людзей або журналістаў, якія выконваюць службовы абавязак, – героі, а хто змагаецца за свабоду – гэта тунеядцы, крымінальныя элементы, прастытуткі, наркаманы, бамжы. Як іх столькі знайшлося ў дзяржаве, дзе "железно" ўсталяваны "стабильность и порядок"?

Праўда ў тым, што ў параўнанні з маніфестантамі іншых краін, дзе даходзіць да пагромаў, беларусы на пратэстах застаюцца мірнымі людзьмі. Тым не менш, рэжым наладзіў не толькі фізічны, але і маральна-псіхалагічны здзек над грамадствам. Зроблены выклік народу: мы парушаем законы, глумімся, здзекуемся над вамі, пакуль не задушым пратэсты. А вы, акрамя выхадаў пад дубінкі, нічога зрабіць не можаце. Ніякіх перамоў з вамі не будзе. Гэта небывалы, гранічна злавесны аспект у стасунках улады і народа, своеасаблівае "ноў-хаў" дыктатара.

Трэба адкрыта гаварыць і пра тое, што касмапалітызм "вярхушкі" не такібяскрыўдны, як здаецца. Дэнацыяналізаваным, зрусіфікаваным чыноўнікам, дэпутатам і сілавікам не патрэбны чыннікі нацыі: родная мова, гістарычныя нацыянальныя сімвалы, традыцыі. Яны перашкаджаюць захоўваць дыктатуру.

Куды завядуць незалежную Беларусь "всеядные" індывіды, калі іх не спыніць, нават страшна падумаць. Да такіх людскіх "экземпляраў" дапасуюцца словы неўміручага А. Чэхава: "Можно и капитал наживать, и невинность соблюдать, быть зверем и в то же время счастливым".

Айчыну сёння берагуць не прадстаўнікі гэтак званай "эліты", а звычайныя беларусы. Яны зразумелі важнасць нацыянальнага адраджэння і сталі на яго абарону.

Дзе жоўта-блакітныя прапары, пра якія я згадаў у пачатку роздуму? Лунаюць над вольнай Украінай! Не стала горш украінцам і ад таго, што актыўней размаўляюць на роднай мове. Яны адчулі сябе народам.

А як выглядае правіцель Беларусі, калі палохае ўсіх апазіцыянерамі, якія могуць увесці вывучэнне мовы карэннага народа (84% жыхароў згодна перапісу – беларусы) з дзіцячага садка?

"Хітрыкі" не пройдуць! Стыхія народнага гневу заўжды мацней мясцовага прыгнёту і іншаземнага нашэсця, яна змые з роднай зямлі любую пошасць: сваю або чужую.

Вызваленне ад дыктатуры дазволіць перавярнуць жыццё ў Беларусі з галавы на ногі, каб грамадства магло карыстацца галавой для стваральных задум і здзяйсненняў. Мы цвёрда станем на роднай зямлі і пакрочым у будучыню.

Помощь беларусам от Германии в борьбе с пандемией

Посольство Федеративной Республики Германия в Минске рассказало о сотрудничестве с нашей страной в этом направлении.

СОБ. ИНФ

За последнее время был реализован ряд проектов.

Так, в Беларусь передано 6 аппаратов для искусственной вентиляции легких в клиники Минска, Могилева и Витебска.

В медицинские учреждения столицы и Полоцка поступили анализаторы и комплектующие к ним на сумму 200 000 евро.

Посольство Германии долгое время сотрудничает с ОБО «Белорусский детский хоспис» и домами-интернатами для престарелых и инвалидов в Бабиничах, Смолевичах, Мозыре и Ирдице. В пандемию туда переданы дезинфекционные средства и оборудование для предупреждения распространения инфекции на общую сумму 25 000 евро.

Посольство Германии выражает большое уважение врачам, медицинскому персоналу и социальным сотрудникам белорусских учреждений в их самоотверженной борьбе с Covid-19.

Павлу Северинцу продлили срок содержания под стражей

Политик останется под стражей еще как минимум на два месяца, сообщила его жена Ольга Северинец.

INTERFAX.BY

«Срок содержания Павла Северинца по следственному процессу продлен еще на два месяца. Пошло движение по делу», – написала она на своей странице Facebook в пятницу.



Павел Северинец был задержан 7 июня возле дома после возвращения с акции. На следующий день он был осужден на 15 суток ареста.

«Во время отбывания наказания у него было еще как минимум три административных судебных заседания, на которых ему добавляли каждый раз по 15 суток (всего он получил 60 суток в течение месяца)», – проинформировали правозащитники.

Также у Северинца оставались не отбытыми 30 суток, полученные за участие в акциях против «интеграции» с Россией, которые проходили в декабре 2019 года.

Однако и после отбытия всех этих суток на свободу политик так и не вышел.

Ранее международная организация Amnesty International объявила акцию срочной помощи по освобождению Северинца, заявив, что располагает информацией о жестоком обращении с ним. Организация также признала его узником совести.

А праз некалькі гадоў нас карацьмуць без судоў


Мінскага студэнта Яна Салановіча восем разоў судзілі за ўдзел у нядзельных маршах, ён адсядзеў у ізалятары 114 дзён, а нядаўна яго нечакана выпусцілі, хоць адбываць пакаранне трэба было яшчэ месяц.

На пратэсты меў надзею
(Дый, бадай, не ён адзін),
І таму заўжды ў нядзелю
Ён па вуліцах хадзіў.
Ці ж падумаць мог хлапчына,
Ідучы ў людской гурме,
Што, лічы, без дай прычыны
Ён акажацца ў турме?
Ці ж на ўсіх магчыма скласці
Адпаведны пратакол?
Пратэстантаў жа, на шчасце,
Сотні, тысячы вакол.
"Небяспекі, – думаў, – мала,
Не сядзецьму я ні дня".
Ды аднойчы затрымала
Міліцэйская гайня.
І чамусьці ў райаддзеле
Распусціў язык юнак:
– Я не першую нядзелю
Пратэстую!
Думаў так:
"Не дадуць мне большай кары,
Бо "сем бед – один ответ".
Спалірую трохі нары
І з цямніцы выйду ў свет".
Памыліўся дужа ўсё-ткі
І здзівіўся ён, калі
У судзе з-за кожнай ходкі
"Суткі" новыя далі.
Не адзін, выходзіць, месяц
Будзе бавіцца ў турме,
Хоць спачатку сутак дзесяць
У яго было наўме.
І, вядома, нашы людзі
Шкадавалі юнака:
Тэрмін, думалі, адбудзе
Ад званка і да званка.
Ды начальнік каталажкі
Мовіў голасам суддзі:
– Што, забыў свае замашкі?
Так і быць, дамоў ідзі.
Не бунтуй! – дадаў сурова, –
Бо іначай – зноў турма.
І з ягоных слоў выснова
Нарадзілася сама:
Людзі ў нас – як Папялушкі,
Хоць і ў роднай старане:
Іх, людзей, закона служкі
Хочуць – садзяць, хочуць – не.
* * *
Будзе рай для пінкертонаў,
Бо праз некалькі гадоў
Нас карацьмуць без законаў
Дый, напэўна, без судоў...

Калі трэба, прастытутка снег пачысціць вельмі хутка

Кіраўніцтва Мінгарвыканкама прыняло рашэнне задзейнічаць прастытутак ва ўборцы снегу на вуліцах горада. Звычайна путан караюць штрафамі, аднак выплачваць іх "жанчыны лёгкіх паводзін" не спяшаюцца.

То не плёткі і не чуткі,
Хоць кагосьці возьме смех:
У сталіцы прастытуткі
Узяліся чысціць снег.
Без ахвоты, скажам прама,
Снег варочаюць яны:
Быў загад гарвыканкама,
Так прыдумалі чыны.
Столькі снегу навалiла –
Ні праехаць, ні прайсці!
(Хоць камусьці глянуць міла:
Толькі ў колішнім жыцці
Тут былі такія зімы,
А цяпер таго няма:
Шпацыруем па гразі мы,
Хоць як быццам і зіма.)
Гэты снег растане з часам,
Стане брудная вадой,
Толькі зараз жылкамгасам
Толкам справіцца з бядой
Не ўдаецца, бо работы
Не на пару-тройку дзён:
Каб разгрэбці ўсе сумёты,
Трэба цэлы легіён.
Ход прыдумаў нечаканы
Нехта з мудрай галавой:
– Ёсць у нас рэзерв – путаны.
Хай імпэт праявяць свой
Не з кліентамі ў пасцелі,
А на вуліцах, дзе снег.
Прадавалі дзеўкі целы –
Выкупляць патрэбна грэх.
Будуць самі, без прынукі
Грэбці, грэшныя, яны.
Як дадзім рыдлёўкі ў рукі,
Дык не будзе ім цаны!
Мудры член гарвыканкама
Меў падтрымку ад калег –
Пагадзіліся таксама:
– Хай путаны чысцяць снег.
Справай займуцца харошай,
Спрыт пакажуць малады,
Бо плаціць не хочуць грошай,
Як штрафуюць іх суды,
Так што ход і праўда лоўкі!
І з-за "мудрасці" такой
Прастытуткі за рыдлёўкі
Узяліся талакой.



Алесь Няўвесь

ВЕРШАВАНЫЯ ФЕЛЬЕТОНЫ

А якія перамены
Адбыліся ў нас, калі
"Жрыц кахання" лабутэны
Гурбы снегу падзяўблі?
Вынік годны, не паганы,
Бедаваць няма падстаў:
Снег пачысцілі путаны!
Ці, магчыма, сам растаў...
* * *
Не жылі б нідзе па-свінску,
Быў бы ў вуліц добры стан,
Каб і ў Гомелі, і ў Мінску
Мелі мы пабольш путан.

Так о чем сказал Макей?

Смотрю, вызвали нездоровую сенсацию слова Макея на Всебелорусском собрании о возможном исключении нейтралитета из Конституции. Сергей Наумчик даже предупредил о трупах белорусских солдат из горячих точек после конституционной реформы. А это уж вообще никак не связано. Поэтому поясняю.

ДЕНИС МЕЛЬЯНЦОВ, КООРДИНАТОР ПРОГРАММЫ «ВНЕШНЯЯ ПОЛИТИКА БЕЛАРУСИ»

Вообще, в Конституции никогда не было и нет запрета на участие в боевых действиях за границей. Не знаю, кто придумал этот миф, но он оказался крайне устойчивым. Его постоянно приводят в политических речах как оппозиционеры, так и представители власти. Особенно занятно, что Лукашенко тоже таким грешит. Хотя, казалось, бы он должен быть в курсе.

С начала 2000-х годов была сформирована юридическая база для направления наших военнослужащих за границу для участия в разного рода военных миссиях. Была создана миротворческая рота. Постоянно ведется подготовка личного состава для миротворческих и иных операций за границей.

Второй момент. Нейтральный статус страны вообще никаким образом не связан с заграничными военными миссиями. Что такое нейтралитет? Это не отказ от армии, участия в войнах и миссиях за границей, как многие ошибочно полагают. Такие классические нейтральные страны как Швеция и Финляндия, например, участвовали в войне в Афганистане под эгидой НАТО. Нейтралитет – это неучастие в военных блоках, которые накладывают на страну чёткие обязательства военной взаимопомощи в случае внешнего нападения на одну из стран блока.



В какой ситуации оказалась Беларусь? В Конституции у нас нет положения о нейтралитете, у нас обозначено лишь СТРЕМЛЕНИЕ к такому статусу. При этом Беларусь давно является полноценным членом ОДКБ – военного блока, и обязана в том числе военными методами оказать помощь своим союзникам в случае нападения. Из ОДКБ никто пока выходить не собирается. Даже оппозиция предпочитает эту тему не подымать, понимая возможные последствия.

Вместе с тем, ранее белорусские власти в рамках концепции многовекторности и «ситуационного нейтралитета» в мирное время (подчёркнуто) демонстрировали стремление максимально дистанцироваться от любых конфликтов и даже играть роль переговорной площадки по кризисному урегулированию. Политический кризис лета-осени 2020 года и последующая реакция Запада перечеркнули эти усилия. Это, видимо, и стало одним из мотивов предложения министра Макея. По сути он просто предлагает привести текст Конституции к реальности сегодняшнего дня. Да и вчерашнего тоже. Ну не может быть член ОДКБ нейтральной страной. Сколько к этому не стремись. И как этого не хоти.

Поэтому крестик лучше снять.

Каждая вторая беларуска – выпивает

А вот сколько и как часто – это уже глубоко индивидуально. Разбираемся...

TUT.BY

Специалисты спросили у белорусок, употребляют ли они алкоголь и как часто. Оказалось, более 50 процентов трудоспособных женщин в нашей стране выпивают.

В мае – июне 2020 года специалисты Республиканского центра наркологического мониторинга и превентологии провели социологическое исследование, во время которого изучили отношение белорусок к алкоголю. В исследовании участвовала тысяча женщин из разных регионов страны.

– По данным исследования, было установлено, что более 50 процентов женщин в нашей стране в той или иной степени употребляют алкоголь, – рассказал Артем Малмыгин, заведующий Республиканским центром наркологического мониторинга и превентологии РНПЦ психического здоровья. – Основные мотивы приобщения женщин к алкоголю – это желание поднять настроение, расслабиться, культурные традиции, трудная жизненная ситуация, проблемы в личной жизни, а также употребление за компанию.

Во время исследования специалисты также выяснили, какие факторы удерживают женщин от употребления алкоголя. Среди них – плохое отношение к алкоголю, возможные проблемы в семье. Кроме того, более 30 процентов женщин не пьют, так как плохо относятся к спиртному.

– Немало информации о том, что зависимость от тяжелого алкоголя развивается быстрее, чем от легкого. Правда ли это? – уточнили журналисты.

– Нет такого понятия, как легкий или тяжелый алкоголь, – пояснил

Сергей Марчук, врач-психиатр-нарколог, заведующий 18-м наркологическим отделением РНПЦ психического здоровья. – Организму без разницы, поступает этанол в виде дорогого коньяка, дешевой самогонки или вина, но в большом количестве. В любом случае в организм человека попадает этиловый спирт, который оказывает цепочку токсических воздействий на сердце, почки, печень, нервную систему. Поэтому последствия от выпитых двух-трех бокалов коньяка, такие же, как от выпитой бутылки вина. Организм разницу не воспримет. Формирование зависимости происходит не к конкретному виду напитков, а конкретному интоксиканту – этиловому спирту.

АВГУСТОВСКОЕ ВОССТАНИЕ: ЧТО ДАЛЬШЕ. ЧАСТЬ 1

Спад протестной активности в Беларуси ставит ряд вопросов относительно перспектив будущего развития ситуации в стране. А равно требует четкости понимания того, где мы оказались и почему мы там оказались. Ну и традиционно — что делать и есть ли шанс на победу.

В одном материале газетного формата дать исчерпывающие ответы не получится. Да и вообще полноту картины произошедшего мы сможем оценить только по прошествии лет: слишком много остается укрыто от внешнего наблюдателя. Поэтому, не претендуя на полноту понимая картины, я решил сделать небольшой цикл материалов, в которых поделюсь своим видением ситуации и перспектив ее разрешения.

Был ли шанс на победу?

Этот вопрос последние месяцы, пожалуй, волнует всех сторонников новой Беларуси. На самом деле, шанс есть всегда. Другое дело, что есть шансы гипотетические, которые могли бы реализоваться в некоей идеальной ситуации. А есть шансы практические, идущие, как любит говорить Лукашенко, «от жизни». Начнем с первого варианта.

По моему мнению, если бы в первые 2 недели после выборов 9 августа протест приобрел постоянный, непрерывный характер в виде массового митинга-концерта и палаточного лагеря в каком-либо знаковом месте в Минске (например, на площади Независимости) и это сопровождалось бы заявлением Кремля в стиле «не все так однозначно с результатом выборов, надо садиться за стол переговоров», то следствием стал бы быстрый распад системы государственного управления. И уже в октябре А. Лукашенко не смог бы дозвониться до 90% чиновников и силовиков — просто не брали бы трубку.

Но что такое беспрерывный митинг-концерт и палаточный лагерь? А это майдан. Тот самый, которого боялись все протестующие. Но не майдана самого по себе, а реакции на него Кремля. Бытовало мнение, что в ответ на подобный сценарий российское силовое вмешательство становилось бы неизбежным. Как показали заявления Владимира Путина относительно формирования резерва российских силовиков для поддержки беларуского режима, эти опасения были полностью обоснованы.

Надо признать очевидное: практически все, что в той ситуации было можно сделать, не прибегая к насилию, восстание сделало. И хватит заниматься самоедством.

Возможен ли новый business as usually?

Очевидно, что стратегия режима в августе 2020 года изначально строилась на двух соображениях:


— поствыборные репрессии не должны быть масштабными/массовыми, чтобы не вызвать негативной реакции Запада;

— чтобы они были таковыми, необходимо запугать народ жестокостью действий.

После чего поставить и Запад, и Россию перед фактом: «Саня останется с нами». И продолжать задорно раскачиваться на геополитических качелях, рассылая воздушные поцелуи своим «партнерам» взамен за деньги.

Беларуский народ имел на сей счет свое мнение. В результате уже в августе 2020 года режим Лукашенко столкнулся с угрозой масштабной эрозии и последующего распада. Поведение беларуского правителя в течение 2020 года начиная с нефтяной войны с Россией, затем его реагирование на эпидемию Ковида, провокация с бойцами ЧВК «Вагнера», выборные репрессии и совершенно неправдоподобный официальный результат голосования заставил многих внутри госаппарата задуматься и о будущем системы, и о своих персональных перспективах при продолжении подобной неадекватной политики. И лишь публичная поддержка Путиным беларуского правителя привела к консолидации бюрократического и силового аппарата, в основе которой лежало соображение, что «против Москвы в нашей ситуации не попрешь».

Формально чиновники и силовики сплотились вокруг А. Лукашенко. Но по факту — вокруг В. Путина. Собственно, это можно было спрогнозировать по реакции беларусов весной 2020 года на эпидемию китайского коронавируса: наши сограждане действовали по тем установкам, которые раздавались из Кремля. А не от Ковид-диссидентсвовавшего Лукашенко. Беларусы массово ушли на карантин вместе с В.Путиным, проигнорировал военный парад на 9 мая с агитировавшим за трактор и стакан водки А. Лукашенко.



АНДРЕЙ ПОРОТНИКОВ

ЭКСПЕРТ

Ситуация, когда беларуская бюрократия (гражданская и в погонах) смотрит в сторону Кремля гораздо более внимательно, чем в сторону своего формального суверена, дает Москве совершенно другие возможности по влиянию на внутрибеларусскую ситуацию и ставит Лукашенко в крайне зависимое положение. Что последний четко понимает.

Это объясняет периодически появляющиеся заявления о том, что Минск не отказывается от многовекторной политики и заинтересован в развитии отношений прежде всего с США. Доходит до смешного из-за неадекватности: на реализацию программы экономического развития Премьер-министр Беларуси Роман Головченко хочет найти деньги на Западе. А только если западники денег не дадут — заняться их поиском в России и Китае.

Очевидно, беларуская верхушка пребывает в надежде вновь усесться на геополитические качели: Западу рассказывать сказки про Лукашенко как единственного гаранта независимости Беларуси (что ложь), сдерживающего Россию (что правда); Москве про то, что любой, кроме Лукашенко, развернет Беларусь на Запад. Песни эти давние, и на их исполнении официальный Минск собирал многомиллиардные «кассовые сборы», в основном с востока.

Но в этот раз ситуация иная: в Минске просто нет переговорщика для Запада. А. Лукашенко нерукоподаваем, ситуация российско-украинской войны 2014 года, которая привела к ренессансу отношений официального Минска с Западом слишком уникальна, чтобы повториться. Без российского вторжения в Украину летом 2014 года беларуский правитель по-прежнему пребывал бы в политической изоляции, в которой он оказался после президентских выборов 2010 года. Тогда восстановление отношений с Минском стало вынужденной реакцией Запада на российский экспансионизм.

Глава МИД Беларуси Владимир Макей долгие годы рассматривался в качестве неформального лидера либеральной, прозападной части беларуской верхушки. В пику силовикам, которые якобы все как один ориентированы на Москву. Макею был создан имидж сверхвлиятельного чиновника. Фактически человека №2 в стране. Вспомним вбросы про то, что он может стать чуть ли ни приемником самого Лукашенко. На самом деле это была банальная игра в плохого и хорошего полицейского, «разводка». А уровень влияния как и прозападность В. Макея оказались сильно преувеличены. Скандально-хамские заявления беларусского МИДа в адрес Запада, равно как и крайние пассажи самого В. Макея про «фашиствующую демократию» и отказ от стремления страны к нейтралитету, не делают его персону заслуживающей доверия в глазах Запада.

Поэтому любая попытка Минска уравновесить Москву Западом потребует серьезной перестройки беларуского режима и введения туда новых персоналий, не замазанных репрессиями против народа или их поддержкой. И выведением наиболее одиозных персонажей. А с учетом всех отягчающих ситуацию факторов (сотни политзаключенных, пытки и убийства, голословные обвинения Запада в подготовки агрессии против Беларуси) и скорости выработки необходимых решений это займет годы. Которых у режима, по-моему мнению, уже нет.

В следующей части мы рассмотрим природу текущих событий в Беларуси. Понимание которой и даст ответ на вопрос, за кем же в итоге будет победа.

В чем обвиняют Виктора Бабарико?

Ему вменяется руководство организованной преступной группой, состоящей из заместителей.

По данным следствия, топ-менеджеры «Белгазпромбанка», действуя в интересах ряда коммерческих структур, в период с 2004 по 2020 год незаконно получала от представителей этих организаций незаконные денежные вознаграждения, сообщает «Интерфакс-Запад».

Заседание проходит в суде Московского района. Председательствующий судья Игорь Любовицкий. На скамье подсудимых топ-менеджеры Александр Ильясюк, Дмитрий Кузьмич, Сергей Добролет, Виктор Бабарико, Сергей Шабан. Алексей Задойко присутствует в зале суда, он находится под домашним арестом. Им предъявлено обвинение в получении взяток в особо крупном размере, организованной группой, по ч.3 ст.430 Уголовного кодекса Беларуси.

По данным следствия, проверка на причастность должностных лиц Белгазпромбанка к коррупционным преступлениям начата в 2018 году. Утверждается, что топ-менеджеры банка получили взятки от ряда корпоративных клиентов с начала 2004 года до середины июня 2020 года на сумму почти Br30,5 млн (более $11,5 млн по текущему курсу — ИФ).

Также утверждается, что «продолжая преступную деятельность, Бабарико в период с 10 ноября по 27 декабря 2018 года для придания правомерности владения, пользования и распоряжения денежными средствами, заведомо полученными преступным путем, совершил финансовые операции по приобретению расположенных в Минске двух капитальных строений на сумму свыше Br1 млн и другого имущества».

Вину в инкриминированных преступлениях обвиняемые, кроме Бабарико, признали в полном объеме.

Время встряхнуться и зажать портфель под мышкой

Начну с двух цитат, автора которых угадать несложно. «Я пожизненно не буду за эту должность держаться. Как только народ откажется от моих услуг, я порт-фель под мышку и уйду» (26 ноября 2012 г. в интервью информационному агентству «Рейтер»). «Пока последний омоновец мне не скажет уходить, я буду наглухо стоять в этой стране рядом с вами плечом к плечу» (30 декабря 2020 г. при посещении отряда милиции особого назначения ГУВД Мингорисполкома).



СЕРГЕЙ НИКОЛЮК

ПОЛИТ-ЛИКБЕЗ

